Заставайцеся з намі ў новым годзе! Ужо можна аформіць падпіску на «МГ» на першае паўгоддзе 2024-га.


# МАЛАДЗЕЧАНСКАЯ ГАЗЕТА

Грамадска-палітычнае выданне. Заснавана ў верасні 1939 года

12+

СЕРАДА 13 снежня 2023 года №93 (13027)


ПАДПІШЫСЯ АНЛАЙН

ЮНЫЯ СЯБРЫ ПРЫРОДЫ



## Коломна аплодировала молодечненцам

Дипломом лауреата II степени Московского открытого хорового конкурса «А.В. Свешников и современность» награжден образцовый хор «Жураваčка» детской школы искусств 4 стр.

## Быць шчаслівым і радаваць іншых, нягледзячы ні на што



Фота: Аляксей ПЛАТКО.

# Прылятайце, птушкі, у нашы кармушкі!

**У СШ №1 імя Янкі Купалы праходзіць акцыя «Дапамога птушынаму сябру», у ходзе якой усе класы з трэцяга па адзінаццаты выраблялі кармушкі. У выніку больш за 30 самых разнастайных домікаў прадстаўлены на выстаўцы ў фае другога паверха. А зусім хутка дзеці і педагогі павесяць іх на дрэвах вакол школы, напоўняць кормам.**

*Працяг чытайце на 8-й стар.*

8 снежня ў Барысаве адбыўся фінал V абласнога фестывалю творчасці людзей, якія маюць інваліднасць, «Снежаньскі карагод»

5 стар.




## Наполните дом хвойным ароматом

С 20 декабря Молодечненский лесхоз приглашает на елочные базары, где можно будет приобрести новогодние деревья

5 стр.

ЮНЫЯ СЯБРЫ ПРЫРОДЫ

# Прылятайце, птушкі, у нашы кармушкі!

*Пачатак на 1-й стар.*

— Тэрыторыя нашай школы вялікая, на ёй расце нямала дрэў, як хвойных, так і лісцевых, пасаджаны яблыневы сад. І птушак прылятае шмат. Сінічкі, нібы ручныя, могуць на падаконнік сесці, у акно дзюбкай пастукаць, нібы просяць, каб дапамаглі ім зімой пракарміцца. Вось мы і вырашылі правесці такую акцыю, вучні і іх бацькі яе падтрымалі, — расказвае намеснік дырэктара школы па выхаваўчай рабоце Наталля Вяршыцкая.

Калі глядзіш на гэтыя домікі, нельга не здзівіцца, з якім творчым падыходам, фантазіяй майстравалі іх дзеці разам з дарослымі. Васьмікласнік Ягор Карпіцкі паказвае нам свой выраб — трохвугольную кармушку з папулярнай прасаванай шчапы ў выглядзе... кавалка сыру з круглымі дзіркамі, праз якія птушкам будзе зручна залятаць.

— Гэта ідэя майго таты, які выразаў гэтыя дзіркі лобзікам, — расказвае Ягор. — Мы жывём у сваім доме і ў двары таксама павесілі кармушку, толькі больш простай формы. Да яе прылятаюць вераб'і, сініцы.

— І мы з татам майстравалі кармушку, — падключаецца да размовы сямікласніца Аніта Грузд. — Тата выразаў дэталі, збіваў, а я фарбавала ў белы колер. У нас ля дома вісіць такая ж, і да яе пастаянна прылятаюць сінічкі, снегіры, вераб'і.



**Аніце Грузд і Ксеніі Сямёнавай дапамаглі таты, Максіму Балышу — дзядуля.**

Некаторыя класы прадставілі на выстаўку па некалькі кармушак. А найбольш іх змайстравалі 6«Г» (класны кіраўнік Аляксандра Міцкевіч). Цікавыя, вельмі эстэтычныя работы ў 3 «Б» класа (класны кіраўнік Святлана Карчміт), 4«Б» класа (класны кіраўнік Наталля Вяршыцкая).

Пасля знаёмства з выстаўкай і аўтарамі самых цікавых экспанатаў мы парадаваліся, што вучні не проста дружна паўдзельнічалі ў конкурсе, але і дома павесілі кармушкі, каб дапамагчы птушкам пракарміцца халоднай, снежнай зімой.

**Анжаліка КРУПЯНЬКОВА.**
**Фота: Аляксей ПЛАТКО.**

## ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

**Чым лепш карміць птушак?**

**Арнітолагі рэкамендуюць пшаніцу, ячмень, проса, авёс, аўсянку ці аўсяныя шматкі, падсушаны белы хлеб. А вось чорны хлеб катэгарычна забараняецца: у жытнёвых зярнятах шмат крухмалу, птушкі яго дрэнна засвойваюць, што можа нават прывесці да іх гібелі. Таксама крылатыя будуць рады несалёнаму салу, але яго не павінна быць шмат.**



**«Кармушку майстраваў мой дзядуля, а я яе ўпрыгожвала», — расказвае Дар'я Сокал.**